
Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ



Наша слова



Газета выходзіць з сакавіка 1990 года № 23(357) 17 ЧЭРВЕНЯ 1998 г.

ПОМНІК ЛАРЫСЕ ГЕНІЮШ

"Бацька, і маці, і родная мова
Для беларусаў-
пытанне жыцця"

Хто не ведае гэтыя лапідарныя словы выдатнай паэтэсы Беларусі Ларысы Геніюш? Яе партрэт у выкананні ўжо нябожчыка мастака Сямёна Геруса не аднойчы выстаўляўся на многіх выставах, якія ладзіў клуб "Спадчына" ў абарону роднай мовы. І заўсёды наведвальнікі звярталі ўвагу на гэтыя словы, ажыўлена іх абмяркоўвалі. Нагадаем, што рэпрадукцыя гэтага партрэта змешчана ў кнізе Анатоля Белага "Любіць Радзіму - шанаваць родную мову", якая выйшла зусім нядаўна.

Вось чаму ў клуба "Спадчына" ужо даўно ўзнікла жаданне зрабіць помнік Ларысе Геніюш і ўсталяваць яго ці ў Менску, ці на радзіме паэтэсы. Такое ж жаданне было і ў душах прыказчыка Ларысы Геніюш вядомага вучонага і грамадскага дзеяча Міколы Чарняўскага, які з 1982 года захоўвае яе рукапісы, а ў 1993 выдаў яе кнігу "Споведзь", якая адразу ж стала падзеяй ва ўсім літаратурным, культурным і грамадскім жыцці Беларусі.

Менавіта Мікола Чарняўскі дамовіўся з земляком Ларысы Геніюш студэнтам-выпускніком аддзялення скульптуры тэатральна-мастацкага інстытута Міхасём Іньковым выканаць для абароны сваёй дыпломнай работы помнік землячцы. Пад кіраўніцтвам вядомага і дасведчанага педагога Анатоля Яўхімавіча Арцымонава пачалася праца над помнікам. Калі ён быў зроблены і абаронены на "выдатна", то паўстала задача зрабіць з яго формы і адліўку ў гіпсе. Трэба было зберагчы працу, інакш пасля заканчэння вучобы ўжо нікому не патрэбны помнік проста паламалі б і выкінулі б на сметнік.

Грошай на гэтую справу не было. І тады Міхась Чарняўскі здымае са сваёй ашчаднай кніжкі апошнія зберажэнні і ахвяруе іх на гэтую справу. Зробленa гіпсавая форма, адліты гіпсавы помнік. Але зноў няма грошай. І тут да гэтай двойкі далучаецца Анатоль Белы. Ствараецца калектыў аднадумцаў, якія жадаюць аднаго - знайсці спосаб і грошы, каб іх жаданне паста-віць помнік Ларысе Геніюш здзейснілася.

Анатоль Белы едзе ў Амерыку і там праз часопіс "Палачак" двойчы звяртаецца да прадстаўнікоў беларускай дыяспары па дапамогу, а таксама асабіста абзваньвае многіх і просіць іх ахвяраванняў.

Мы яшчэ раз выказваем вялікую падзяку тым, хто адгукнуўся на заклік клуба "Спадчына" і яго старшыні Анатоля Белага - Святлане Белай, Кацярыне Вініцкай, Мацвею Рэпкаў-Смаршчку (Анатоль Бярозка), Ганне і Кастусю Мерлякам, Міколе Латушкіну, Міколе Грэбеню. Вялікі вам дзякуй і нізкі вам паклон за вашыя ахвяраванні. З пачатку 1996 года пачаўся працэс адліўкі помніка. Але ён ішоў вельмі марудна. Майстар-ліцейшчык болей клапаціўся, каб датэрмінова атрымаць усе дамоўныя грошы, чым адліць помнік. Вымушаны былі забраць каваль-кі помніка са шматлікім бракам, адвезці іншым спецыялістам, зноў плаціць грошы. Адліўка помніка была такая ж пакутная, як і лёс самой Ларысы Геніюш. Але ўрэшце помнік быў зроблены, прыняты Міхасём Іньковым і Анатолем Белым і дастаўлены імі 18 ліпеня 1997 г. у Дом літаратуры, дзе ён цяпер і стаіць у кабінеце сакратара СП Уладзіміра Паўлава.



Будзем жа спадзявацца, што праблема ўсталявання помніка ў м.Зэльва, дзе апошнія гады свайго жыцця правяла пісьменніца, не будзе такі цяжкі, а Міністэрства культуры і раённыя ўлады Зэльвы пойдуць насустрач грамадскасці і не будуць чыніць ніякіх перашкодаў па ўзвядзенню помніка слыннай дачцы Беларусі, выдатнай паэтэсе Ларысе Геніюш. Нехай так будзе! Нехай узвядзенне помніка стане святам для ўсіх Беларусаў, хто любіць і паважае творчасць і ідэалы Ларысы Геніюш. Нехай гэты акт стане прымірэннем паміж рознымі палярызаванымі сіламі нашага грамадства. Нехай дзень 9 жніўня, у які нарадзілася Ларыса Геніюш і ў які размічваем адкрыць помнік, стане днём міру, днём прымірэння!

Дапамажы нам, Божа, у гэтай святой справе!

Аргкамітэт па узвядзенню помніка Ларысе Геніюш.
Менск Уральская 16-9
тэл. 2-35-66-08

Сойм БНФ "Адраджэньне"

13 чэрвеня ў Менску прайшоў чарговы Сойм БНФ "Адраджэньне". Асноўныя пытанні, якія выносіліся на Сойм -гэта пытанне пра развіццё Ўсебеларускага грамадскага руху "Грамадзянства БНР", а таксама пытанне "Пра інфармацыйную палітыку Фронту". Сойм прыняў заявы: "У абарону газеты "Наша Ніва", "У падтрымку патрыятычнай пазіцыі Беларускай федэрацыі футболу", "Не культурнаму генацыду беларускай нацыі!", рэзалюцыю "Аб правакаванні дыпламатычнага скандалу ўладамі Беларусі"

"Не" культурнаму генацыду беларускай нацыі!

Заява Сойму БНФ "Адраджэньне" 13 чэрвеня 1998г.


На працягу апошніх стагоддзяў адукацыйная палітыка Беларусі праводзілася рукамі калабарантаў пад пільным ідэялагічным кантролем з Масквы. Пэўнае паслабленне гэтага кантролю адбылося на пачатку 1990-х гадоў пры распадзе расейска-савецкай імперыі. У выніку гэтага, па ініцыятыве беларускай інтэлегенцыі, былі створаны Беларускі гуманітарны адукацыйна-культурны цэнтр і ліцэй пры ім. За 8 гадоў свайго існавання ліцэй пераканаўча давёў, што на беларускай мове можна атрымаць і сёння адукацыю еўрапейскага ўзроўню і што ўнашай краіне ёсць вельмі шмат дзяцей і іх бацькоў, якія хацелі б менавіта такой адукацыі.

Якраз таму антыбеларускі рэжым, які незаконна знаходзіцца ля ўлады ў нашай краіне спрабаваў і спрабуе знішчыць Беларускі гуманітарны ліцэй. Існаванне гэтага ліцэю не ўваходзіць у планы маскоўскіх стратэгаў культурнага генацыду беларускай нацыі ды іх тутэйшых памагатых. Пасля няўдалай леташняй спробы пазбавіць ліцэістаў законна належнага ім будынка ўлады маюць намер зусім ліквідаваць Беларускі гуманітарны ліцэй праз падпарадкаванне яго расейскамоўнаму ліцэю пры БДУ. Гэтыя ўлады цудоўна ведаюць, што распрацаваныя на высокім навукова-педагагічным узроўні навучальныя праграмы Беларускага ліцэю не могуць быць зрэалізаваныя ў аб'яднаным ліцэі, што педагагічны калектыў ліцэя БГКАЦ будзе дашчэнту разбураны. І тым не менш, яны імкнуцца ажыццявіць знішчэнне ўнікальнай навучальнай установы. Аўтарам гэтага праекту выступае сам А. Лукашэнка, а яго архітэктарам - сумнавядомы палкоўнік У. Замяталін, хоць сапраўднае яго аўтарства трэба шукаць у Маскве.

Сойм БНФ "Адраджэньне" выказвае сваю салідарнасць з калектывам выкладчыкаў Беларускага гуманітарнага ліцэю, ліцэістамі і іх бацькамі ў справядлівым змаганні за канстытуцыйнае права на адукацыю еўрапейскага ўзроўню на роднай мове. Мы ўпэўненыя, што тых, хто плануе і рэалізуе культурны генацыд беларускай нацыі, хто нішчыць беларускія навучальныя ўстановы, цэнзуе і пускае пад нож беларускія падручнікі, пераследуе па палітычных матывах беларускіх настаўнікаў чакае іх Нюрнберг.

Жыве культурная, адукаваная Беларусь!

Бюлетэнь БНФ



Пабачыў свет першы нумар інфармацыйнага бюлетэня "Беларускі Народны Фронт "Адраджэньне". Бюлетэнь утрымоўвае ўсе дакументы, прынятыя Соймамі БНФ за апошні час, артыкул Зянона Пазьняка "Вяртаньне БНР", іншую інфармацыю. Фармат А-4. Аб'ём 12 палос. Наклад 299 паасобнікаў. Рэдактар Валеры Буйвал. Набыць бюлетэнь можна ва ўсіх раённых і гарадскіх радах БНФ "Адраджэньне".

Гэты нумар газеты"Наша слова" надрукаваны за кошт ахвяраванняў беларусаў Вялікабрытаніі

Беларускія СМІ пра беларускую мову

Агляд і каментары Язэпа Палубяткі

Мы скінулі з сябе цяжкую бетонную пліту расейскай асіміляцыі — і адразу мова наша ажыла, зашумела, закрасавала ... Ды, на вялікі жаль так працягвалася ўсяго некалькі гадоў.

... Чыноўнікі і не думаюць вывучаць беларускую мову, яны цяпер кажуць так: а навошта яна нам здалася?

... За беларускае слова б'юць гумовымі палкамі і кідаюць у турмы, штрафуюць мільённымі штрафамі.

Уладзімір Дамашэвіч
НВ 22.05.98г.

* * *

І справа тут зусім не ў тым, што бацькі адвярнуліся ад беларускага слова з-за неадацэнкі ці непавагі да яго. Цяпер яны ў большасці вымушаны выбіраць рускую мову з прагматычных меркаванняў.

Міхаіл Пузіноўскі
НВ 19.05.98г.

* * *

І ўсё ж такі не магу не спытаць, чаму вы спяваеце менавіта на беларускай мове ?

— А навошта нам іншая, калі ёсць свая родная, на якой можна выказаць любыя думкі, любыя пачуцці.

З інтэрвію ансамбля "Незалежная Рэспубліка Мроя"
НВ 2.06.98г.

* * *

Мову не абараняюць, на ёй гавораць; культуру не абараняюць, а спажываюць яе прадукцыю.

... У вялікіх гарадах Беларусі беларускамоўных цяпер прыкладна столькі сама, як заражаных СНІДам.

Андрэй Каўчук
Наша Ніва № 10 1.06.98г.

* * *

Але называць наш народ мудрым язык не паварочваецца. Гавораць жа, што суверэнітэт краіны — бацька народа, мова — яго маці. Дык як жа можна называць дзяцей, якія прадаюць свайго бацьку, цураюцца роднай маці, жыўём закопваюць яе ў зямлю.

М. Тананка
"НВ" 3.06.98г.

Брава, Ірына!


21 мая 1998 г. кіраўнік газеты "Имя" І. Халіп надрукавала цікавы артыкул пад назвам "Беларуская мова, як фактар рызыкі". Сутнасць артыкула ў тым, што праз тры гады пасля сумнавядомага рэферэндуму на Беларусі размаўляць па-беларуску стала вельмі небяспечна. Сп.Халіп прывяла факты аб знішчэнні беларускасці ў розных сферах грамадскага жыцця нашай краіны і вывяла канкрэтную выснову: "Захаваць беларускую мову — гэта толькі наша справа. Захад нам у гэтым не дапаможа". Святыя словы і сказаны своечасова. Засталося толькі пажадаць сп.Халіп пачаць з сябе і адкрыць беларускую старонку у газеце "Имя".

Алег Трусаў, першы намеснік Старшыні ТБМ імя Ф.Скарыны.
6.06.98г.

ТБМ у школах

25 траўня 1998 г. суполка ТБМ Ленінскага раёна г.Менска наведала школы № 2 і № 15. На апошнім званку старшыня Свіслацкай Рады БНФ А.Лагутаў павіншаваў вучняў з заканчэннем навучальнага года, падараваў цудоўныя кнігі беларускіх пісьменнікаў, пажадаў быць вартымі грамадзянамі нашай краіны, адраджаць сваю Бацькаўшчыну, вучыць беларускую мову. У віншаванні вучняў прынялі удзел сябры ТБМ Л. Соўпель, М.Урбан, К.Палюховіч, В.Грузноў.

Грузнова I.У.



№ 23(357) 17 ЧЭРВЕНЯ 1998 г. Наша слова

"... каб не ўмерлі!"

КОНКУРС ПРАЦЯГВАЕЦЦА

У красавіку арганізацыйны камітэт Таварыства беларускай школы абвясціў конкурс творчых работ ***"Не пакідайце ж мовы нашай беларускай ..."***, у якіх прасіў вучняў 4-11 класаў напісаць лісты з пераканаўчымі словамі ў абарону роднай мовы. Гэтыя абвесткі змясцілі розныя газеты "Звязда", "Рэспубліка", "Народная воля", "Літаратура і мастацтва", "Настаўніцкая газета", "Зорка", "Наша слова", часопіс "Бярозка".

Толькі пачатак конкурса азнаменаваўся шматлікай і бясконцай плынню дзіцячых лістоў, у якіх выказваецца боль за лёс роднай мовы недаўменне паводзінамі некаторых старэйшых таварышаў, ад якіх залежыць яе развіццё. Бадай, няма такога раёна ў Беларусі, адкуль не чуўся б устрывожаны і па-свойму ўзбуджаны голас дзіцячы. Назавём вобласці ў тым парадку, адкуль прыйшло найбольшая колькасць лістоў да пачатку лета:

Менская -, Менск -, Віцебская -, Гомельская -, Гарадзенская -, Берасцейская -, Магілёўская -, Ад лідэрнай вобласці прыйшло 165 лістоў, Магілёўскай - 29.

Над падвядзеннем вынікаў працуе журы ў наступным складзе: Уладзімір Ягоўдзік - пісьменнік, галоўны рэдактар часопіса "Бярозка" (старшыня), Алесь Лозка - дырэктар Беларускага навукова-метадычнага цэнтра гульні і цацкі (намеснік старшыні), Сяргей Запрудскі - мовавед, выкладчык кафедры гісторыі мовы Беларускага дзяржунівесітэта, Алесь Бадак - паэт, супрацоўнік часопіса "Бярозка" і педагогі навучальных устаноў г. Менска Рагнеда Аляхновіч, Алёна Дэц, Людзміла Чухрова, Алесь Сядзяка.

Было вырашана асноўны вынік конкурсу з уручэннем грамат і падарункаў падвесці да 3 лістапада 1998 г. На цяперашнім прамежкавым этапе (да 1 чэрвеня) ужо вызначаны ўдзельнікі, якія на асенніх вакацыях атрымаюць граматы ТБШ і ў самы бліжэйшы час льготныя пуцёўкі ў летнікі адпачынку (з 3 верасня па 30 кастрычніка 1998 г.): **у Балгарыю —**

Уладзімір Зінчук (Гомель, СШ № 36, 5 кл.), Вераніка Камароўская (Орша, СШ № 5, 6 кл.);

у Чэхію —

Наталля Говарава (Менск, СШ № 208, 5 кл.), Максім Каржыцкі (Віцебск, СШ № 33, 8 кл.);

у "Зубраня" (з 21 кастрычніка па 19 лістапада) —

Кацярына Захарэвіч (Паставы, СШ №1, 7 кл.), Мікалай Хіла (Менск, СШ № 213, 9 кл.), Кацярына Худалей (в.Карпавічы Вілейскага р., 8 кл.), Святлана Яўсеенка (Гомель, СШ № 36, 7 кл.), (з 24 лістапада па 24 снежня) — Гваздзіцкая Ірына (Мікашэвічы, 6 кл.), Вольга Чычкан (Гародня, 9 кл.), Таццяна Шугальская (Докшыцы, СШ № 1, 9 кл.).

Сярод калектыўных удзельнікаў асабліва вызначыліся вучні 7а класа СШ № 2 г. Клецка (настаўніца М.М.Шыкуць), Беларуска-славянскай гімназіі № 36 г. Гомеля, СШ № 118, 178 г. Менска і інш. Шкада, але маюцца і такія лісты дзе канкурсантамі не пазначаны не толькі нумар класа, але і сваё прозвішча.Наступны перадапошні вынік будзе падведзены да 14 верасня 1998 г. Пішыце нам зноў, запрашайце да ўдзелу ў конкурсе сваіх сяброў. Не забудзьце ўказаць сваё прозвішча і імя і свайго настаўніка, клас і школу, дакладны адрас і тэлефон.

Наш адрас: ТБШ, Някрасава, 5а, Мінск, 220040. Тэл. (017) 2324701.

Тут мы падаём прозвішчы адзінаццацікласнікаў, якім будуць уручаны граматы ТБШ за актыўны удзел у конкурсе.

Менск і Менская вобласць: Баркоўская В. (СШ № 143), Гнаінская А. (ліцэй БДУ), Кіявіцкая Т. (СШ № 153), Мішур Н. (СШ № 52), Глускі А. (Маладзечна), Літвін А. (Лагойскі р.).

Віцебская вобласць: Абрамава В. (Віцебск), Ганчарова Н. (Чашнікі), Кірава А. (Аршанскі р.), Тухальская А. (Расонскі р.),Фянько В. (Глыбокае), Шарэнда А. (Сянно).

Гомельская вобласць: Асвяцкая Н. (Гомель), Касьянчык Р. (Калінкавічы), Падсасонны С. (Буда-Кашалёўскі р.).

Гарадзенская вобласць: Грудзінскі С. (Ліда), Супрон Л. (Шчучынскі р.), Шабан А. (Іўе).

Берасцейская вобласць: Александровіч А. (Баранавічы), Дзюрыч Э.(Драгічынскі р.), Ібрагімава Л. (Кобрынскі р.), Рудзіна А. (Бяроза), Сідарэнка Т. (Столінскі р.).

Магілёўская вобласць: Грамыка А. (Глускі р.), Кажэўнікава А. (Мсціслаў), Мірошкіна Л. і Новікава А. (Магілёўскі р.).

Жадаем далейшых поспехаў!

Алесь Лозка, віцэ-прэзідэнт ТБШ.

Беларуская мова парушае правы чалавека

Дырэктару Менскага аўтамабільнага завода Гурыновічу В.А.


Рада таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны (220007, Мінск,в.Артылерыстаў 9-62) Суполка ТБМ МАЗ (тэхнічны аддзел механазборачнай вытворчасці МАЗ).

Паважаны Валянцін Аркадзевіч! Раённую Раду ТБМ, суполку ТБМ МАЗ непакоіць існуючы стан работы кіраўніцтва завода па адраджэнню дзяржаўнай мовы. На прадпрыемстве аддаецца абсалютная перавага мове ўроўненай у правах з беларускай--расейскай. Канчаткова спынена работа па пашырэнню выкарыстоўвання беларускай мовы, што не спрыяе стварэнню беларускамоўнага асяроддзя і забяспячэння адпаведных правоў чалавека. Многія кіраўнікі падраздзяленняў завода, у большасці Вашы намеснікі, валодаючы адной расейскай мовай, што з'яўляецца парушэннем Законаў аб мовах, аб грамадзянстве і інш. Аб гэтым сведчаць правядзенні нарадаў, сходаў і канферэнцый толькі на адной расейскай мове, што не спрыяе далейшаму вывучэнню беларускай мовы і паволнаму, непрымусоваму далучэнню да яе працоўных. На прадпрыемствах большасць адказных за справаводства асоб не валодаюць беларускай мовай. Ёсць факты, калі на пісьмовыя беларускамоўныя звароты адказы даюцца па-расейску. Спынена замена (ці падача іх двухмоўна) расейскамоўных шыльдаў, назваў прадпрыемства, яго падраздзяленняў, кабінетаў, арганізацый сацыяльнага прызначэння.

Нас здзіўляюць адносіны да выкарыстання беларускай мовы рэдакцыяй газеты "Аўтазаводзец", у якой поўнасцю выціснута дзяржаўная беларуская мова з ужытку. Матэрыялы, што дасылаюцца па-беларуску, перакладаюцца на расейскую мову.

Шчыра спадзяёмся, Валянцін Аркадзевіч, на Вашу свядомасць ва ўзнятых пытаннях і становучае іх вырашэнне.

Старшыня Рады ТБМ раёна Мікола Лавіцкі
Старшыня суполкі ТБМ МАЗ Браніслава Грэская



Старшыні Рады ТБМ Заводскага раёна М.Лавіцкаму, Старшыні суполкі ТБМ МАЗ Б.Грэскай

Паважаны пан М.Лавіцкі!
Паважаная пані Б.Грэская!

На ваша пісьмо за № 26 ад 23.04. 98г. павінен заўважыць, што на Мінскім аўтазаводзе законы аб мовах і аб грамадзянстве не парушаюцца. Кожны супрацоўнік прадпрыемства размаўляе і вядзе перапіску на той мове, на якой лічыць патрэбным. Дакументацыя вядзецца на адной з дзяржаўных моў — расейскай. На гэтай мове мы атрымліваем дакументы з Расеі, Украіны і іншых краін, з якімі мы супрацоўнічаем.

Нарады, сходы і канферэнцыі праводзяцца на той мове, якой валодае большасць прысутных. Гэта не супярэчыць Закону аб мовах. **Прымусовае выкарыстанне толькі адной з дзяржаўных моў з'явіцца парушэннем правоў чалавека.**

Газета "Аўтазаводзец" выдаецца на расейскай і беларускай мовах. Дасыланыя ў газету на беларускай мове матэрыялы будуць друкавацца на мове арыгінала.

З павагай,
Генеральны дырэктар В. ГУРЫНОВІЧ.

ЦІ ПАТРЭБНА БЕЛАРУСАМ ЛІТАРА "Ї"?

Пытанне можа падацца бязглуздым, маўляў, усе кропкі над "і" беларусы даўно расставілі. Аднак, хай тое застанецца маёй прыватнай думкай, якая ні да чога не абавязвае.

Упершыню такая думка ў мяне ўзнікла гадоў дзесяць таму, калі жыў яшчэ ў Латвіі і выпісваў газету "Літаратура і мастацтва". Латышская мова раптам стала дзяржаўнай (хаця і без гэтага дакументацыя на прадпрыемствах да гэтага вялася па-латышску), я, аддаючы даніну модзе, пачаў канверты падпісваць лацінскімі літарамі, ў тым ліку і тыя, якія адсылаў на Беларусь. Якраз адсылаў допіс у "ЛіМ". На канверце, няведаючы чаму, напісаў: "Redakcyji hazety "Litaratyra i mastactva". Потым схамянуўся, што зрабіў памылку — трэба ж пісаць " redakcyi", а не "redakcyji". Перапісваць не стаў, адправіў з памылкай. Аднак зрабіў аналіз — наколькі гэтае пытанне ўвогуле актуальна. Узяў вялікі, на паўстаронкі, "ЛіМаўскі" артыкул і пазначыў у тэксце тыя месцы, дзе на маю думку, заміж "і" можна напісаць "ї". Такіх месцаў, як памятаецца, стался звыш сарака. Ну, прыклад: **їх, маїх, мазаїка,салаўї, Галандыї...**

Вы кажаце, што гэта — "украінскі варыянт"! Такое маўленне не характэрна для беларускай мовы! Не буду казаць пра ўсю Беларусь, але менавіта так вымаўляюць гэты гук на Глыбоччыне і "украіншчынай" тут не пахне, бо гэта ж вам не Палессе. Тым не менш, уся Глыбоччына і суседнія раёны скрозь усыпаны тапонімамі кшталту **Мамаї, Падгаї, Камаї, Кульгаї, Беляї, Шарабаї, Вераб'ї,** дзе гэты гук адчуваецца вельмі выразна і вымавіць яго па-іншаму проста немагчыма.

На працягу шмат гадоў я не вельмі тлуміў сабе галаву гэтым пытаннем. Скажы такое ўслых — засмяюць цябе ўсе філолагі. Аднак, год таму, у Глыбокім, краязнаўчыя доследы звялі мяне з адной сталай жанчынай — Геленай Сініцай. Бабуля лічыць сябе полькай і да час часу папісвае ў газету "Glos znad Niemna". Бачыў у яе цэлы альбом з выразкамі сваіх артыкулаў. Баба Лена часта ўдзельнічае ў розных гарадскіх "тусоўках" на прадмет народнай творчасці, бо пляце саламяныя капялюшы. Між тым бабуля складае прыпеўкі і на добрай беларускай мове. Адна вельмі спадабалася. Прашу яе, каб напісала на паперу для мяне. Ейны адказ мяне засмуціў: "Па-расейску пісаць няўмею, а — толькі па-польску!" — Хай будзе так! — кажу ёй. Калі атрымаў тое, што прасіў, то быў **вельмі** здзіўлены. Аказваецца, з-за нашай вялікай "адукаванасці" мы часам не заўважаем відавочнае. Між тым, у лацінізаванай (польскай) транскрыпцыі баба Лена напісала ўсе "тыя" словы менавіта так, як яны вымаўляюцца: **swajich, jinszy, salauji, jich** і гэтак далей. Улічваючы тое, што на Глыбоччыне трошкі гавораць не так як на літаратурнай мове, бо напрыканцы дзеясловаў вымаўляецца канчатак -іць, -ець (жывець, едзіць), то гук "ї" ў некаторых варыянтах слоў можа сустракацца яшчэ часцей чым у літаратурнай мове: **бегаїць,** заміж **бяжыць.** Усё гэта знайшло адлюстраванне ў напісаным бабуляй тэксце.

Вяртаючыся трохі назад, да тэмы "расейскай" і "польскай" моў, хацелася б адзначыць вось якую дэталь. Пад час прэзідэнцкай кампаніі давялося мне на ровары шмат паездзіць па Глыбоччыне, развозячы ўлёткі "За" Пазьняка. Для мяне было адкрыццём, што нават у блізкіх ад Глыбокага **праваслаўных** вёсках людзі сталага веку (гадоў 80-ці) не бралі ўлётак толькі таму, што "ня ўмеюць чытаць "па-расейску", а — толькі "па-польску"!" На пытанне: "За каго будзеце галасаваць?", казалі: "За каго скажуць, за таго й будзем!" Старшыня калгасу сказаў: "За" Лукашэнку! Чаму не "За" Пазьняка? — Таму, што ваш беларускі язык на хлеб не намажаш!

Гады два таму патрапіла мне на вочы ў Менску маладзёвае выданне "Litva", дзе сярод усяго я заўважыў тэндэнцыйнае напісанне некаторых слоў праз **"йі" (майіх, йіх).** Выходзіць, што гэтае пытанне займае не толькі мяне. Дык, ці патрэбна беларусам "ї"?


Уладзімір Скрабатун г.Глыбокае

А свістаць на іх не спрабавалі?

Напярэдадні дня Перамогі 8 траўня 1998 г. прадстаўнікі дэмакратычных рухаў і партый Ленінскага раёна (ТБМ, БНФ, ПЗС,БСДГ, АГП, Хартыя-97г.) наведалі Нацыянальны тэатр Я.Купалы. Глядзелі спектакль "Князь Вітаўт" А.Дударава. Зала была перапоўнена. Цудоўна гралі акцёры. Мы апынуліся ў часы кіравання князёў Ягайлы і Вітаўта.

Закончыўся спектакль. Усе доўга стоячы дзякавалі акцёрам. І раптам на сцэну выйшла жанчына — прадстаўнік адміністрацыі прэзідэнта Ленінскага раёна і на расейскай мове пачала віншаваць ветэранаў з днём Перамогі. Тады з некалькіх месцаў залы пачулася: "Гавары па-беларуску!" Жанчына пачала апраўдвацца і сышла са сцэны. Яе праводзілі свістам. Выйшаў А.Дудараў і на чыстай беларускай мове павіншаваў усіх, хто вяваў і чый лёс звязан з вайной, пажадаў моцнага здароўя. Мы выйшлі з залы ўзрушаныя гэтым цудоўным спектаклем. Мы яшчэ раз успомнілі нашу гісторыю і нашага славутага беларуса Вялікага князя Літоўскага Вітаўта. Нашая родная, дзяржавы, якая ў часы Вітаўта была адной з магутнейшых у Еўропе на працягу амаль 38 гадоў мае сваю гісторыю. Замаўчаць пра яе нельга і таму тое, што памяць пра тыя часы жыве, ёсць гарантыя таго, што наша Беларусь адродзіцца.

Грузнова Т.У.



Леанід Лыч

Абеліскам уславім беларускую мову.

Люблю наведваць — і раблю гэта ўжо не першы год — мерапрыемствы, што праводзіць Менскі гарадскі культурна-асветніцкі клуб "Спадчына", пязменным кіраўніком якога з 1984 года з'яўляецца апантанец беларускай нацыянальна-адраджэнскай ідэі Анатоль Белы. Толькі за апошнія два гады, дзякуючы яго ініцыятыве і непасрэднаму ўдзелу, праведзены цікавыя і змястоўныя сваімі матэрыяламі выставы: "Дзеячы беларускага замежжа", "Уладары старажытнай Беларусі", за сабраныя ад шматлікіх спонсараў сродкі створаны медныя помнікі: Францішку Скарыне, Міколу Гусоўскаму, Кірылу Тураўскаму, Максіму Багдановічу (у Яраслаўлі), бюст з сілуміну Адаму Багдановічу, помнік Ларысе Геніюш (для Зэльвы), бронзавы бюст Адама Багдановіча (для Яраслаўля), устаноўлена шыльда па будынку ў г. Яраслаўлі, у якім з 1916 па 1918 г. працаваў у эвакуацыі Менскі настаўніцкі інстытут.

Ніколькі не пашкадаваў, што знайшоў час, каб папрысутнічаць на творчай сустрэчы сяброў клуба "Спадчына", якая праводзілася ўвечар 6 лютага г.г.. Самыя розныя пытанні ўздымаліся на ёй, але найбольш запомнілася, як ішло абмеркаванне пра стварэнне мемарыяльнага знака ці нават цэлага комплексу ў гонар нашай пакутніцы — мовы. Бачыў, як у людзей слёзы цяклі з вачэй, калі яны слухалі аповед пра тое ў якіх стрэсавых сітуацыях даводзілася жыць нашаму роднаму слову, і якая трагедыя можа напаткаць яго ўжо ў бліжэйшы час, калі будзем сядзець, склаўшы рукі на каленях, спадзяваючыся толькі на шчаслівы выпадак.

А калі ўважліва прыглядзецца, дык мы і сапраўды нейкія да паталогіі бязвольныя, пасіўныя, а не дык і проста абыякавыя да лёсу матчынага слова, якое так шануюць, любяць усе іншыя народы. Сотні тысяч людзей ходзяць з дыпломамі аб вышэйшай адукацыі, дзесяткі тысяч — з дыпломамі кандыдатаў і дактароў навук, а гаротным станам роднай мовы па-сур'ёзнаму занепалоены толькі якія-небудзь сотні са здаровай нацыянальнай самасвядомасцю беларусаў. Але што яны могуць практычна зрабіць, калі анівodзін з іх не ўваходзіць навat ва ўладныя дзяржаўныя структуры раённага (гарадскога) маштабу? Ва ўсіх народаў пытаннямі выратавання роднай мовы, нацыянальна-культурнага адраджэння займалася ў першую чаргу сама дзяржава, у нас — грамадскія арганізацыі, якія да таго ж не вызначаюцца масавасцю і вялікаю актыўнасцю. Таму мяне вельмі ўзрадавала, што наконт таго, як прыцягнуць ўвагу шматлікіх беларусаў да роднага слова, ёсць вельмі цікавая задумка ў сяброў клуба "Спадчына". Сутнасць яе заключаецца ў стварэнні адмысловай статуі "Беларуская мова". Перад прысутнымі ўжо дэманстраваліся і чатыры яе макеты, (на момант публікацыі прадстаўлена ўжо шэсць макетаў), падрыхтаваныя самымі дасведчанымі ў краіне прафесіяналамі: Людмілай Налівайка, Алесем Цыркуновым, Міколам Несцярэўскім, Алесем Шатэрнікам.



Пачутае і пабачанае на пасяджэнні клуба "Спадчына" не выклікала ў мяне, як і ў многіх іншых, аніякіх пярэчанняў. Нешта падобнае ў сусветнай практыцы ўжо сустракалася. Так, амерыканцы, шануючы і любячы свабоду, матэрыялізавалі сваё стаўленне да яе ў форме велічнай "Статуі свабоды". Нямала розных статуй было пастаўлена некалі ў СССР з мэтай абессмяроціць тыя ці іншыя падзеі ў яго жыцці. Вельмі арыгінальнымі ў гэтым плане аказаліся грузіны. На вялікую зайздрасць нам, іх роднае слова находзілася ва ўсенароднай пашане нават у самы пік бальшавіцкай палітыкі дэнацыяналізацыі духоўнага жыцця савецкіх рэспублік. Аднак, нягледзячы на ўсё гэта, у самым людным месцы Тбілісі ўзводзяць па-майстэрску аформленую, высачэзную стэлу ў гонар сваёй мовы. З усіх бакоў стэлы да яе падножжа і вакол яе на вышыню чатырох метраў на мармуровых плітках тэксты на грузінскай і расейскай мовах высечаны выказванні самых слынных людзей гэтага народа аб яго роднай мове. Аўтару дадзеных радкоў удалося пабачыць Тбіліскую стэлу — мову ўлетку 1981 года. Застаўся вельмі моцна ўражаным. На працягу ўсіх пяці дзён знаходжання ў Тбілісі па некалькі разоў бываў ля стэлы і кожны раз бачыў тут людзей, якія ўважліва ўчытваліся ў змешчаныя на ёй тэксты, хтосьці заносіў некаторыя з іх у свае падарожныя блакноты. Тоўпіліся ў гэтым самым людным і любімым месцы сталіцы Грузіі, як яе жыхары, так і прыезджыя, у тым ліку і замежныя турысты. Пераважалі асобы маладых узростаў. Разыходзячыся ў розныя бакі ад стэлы людзі неяк па-асабліваму выглядалі ўдумлівымі, засяроджанымі. Бяздушных, абыякавых твараў я не назіраў.

Пабачаным у Тбілісі ахвотна дзяліўся са сваімі мінскімі сябрамі. Па-добраму зайздросцілі грузінам, што партыйныя і савецкія ўлады гэтай рэспублікі так шануюць сваю мову. Сур'ёзнай гаворкі аб тым, каб падобную стэлу ўстанавіць і ў Менску, не вялі , бо ўсе разумелі, наколькі такое не рэальна з прычыны зусім процілеглай, чым у Грузіі, падыходу нашых улад да беларускай мовы.

Пачуўшы на лютаўскім пасяджэнні клуба "Спадчына" гаворку аб мемарыяльным ушанаванні беларускай мовы, я без усялякіх ваганняў пагадзіўся з такой задумай. Наша мова і яе прыродныя, актыўныя носьбіты заслугоўваюць такога. Іншая пасля такіх здзекаў, забаронаў з боку дзяржавы даўно б канула ў лету. А Наша ўсё ж не памерла, хаця і па-сапраўднаму жывою яе не назавеш, асабліва калі прыкінеш, якое жабрацкае месца займае яна ў канцылярыях усіх узроўняў заканадаўчай і выканаўчай улады, міністэрстваў і ведамстваў, прадпрыемстваў і ўстаноў, у агульнаадукацыйных школах, ВНУ і тэхнікумах, электронных сродках масавай інфармацыі, а з гэтых прычын і ў зносінах людзей паміж сабой. Адзінае чаго нельга адабраць у нашай мовы — гэта вялікую здольнасць да рэгенерацыі, узнаўлення сваіх патэнцыяльных магчымасцяў. Варта было толькі ў студзені 1990 года надаць ёй статус адзінай дзяржаўнай, як яна з хуткасцю маланкі пачала распаўсюджвацца ва ўсіх сферах нашага грамадскага жыцця, выклікаўшы нечуванае супраціўленне з боку тых шматлікіх палітычных дзеячаў, прадстаўнікоў інтэлігенцыі, якія столькі працы ўклалі ў дэнацыяналізацыю беларускага народа з мэтай усебаковай і грунтоўнай падрыхтоўкі яго да ўступлення ў светлае камуністычнае грамадства.

Заканчэнне ў наступным нумары

АРГКАМІТЭТ
па стварэнню манумента "У гонар роднага слова"

1. Някляеў Уладзімір Пракопавіч (старшыня) — старшыня рады Саюза беларускіх пісьменнікаў, т. 2-36-56-07 (сл).
2. Гніламёдаў Уладзімір Васільевіч (намеснік старшыні) — дырэктар І-та літаратуры імя Янкі Купалы НАНБ, член-карэспандэнт, т. 2-36-44-37 (х.), 2-84-07 (сл.), 2-84-28-87 (прыёмн.).
3. Іпатава Вольга Міхайлаўна (намеснік старшыні). Першы сакратар Саюза беларускіх пісьменнікаў.
4. Белы Анатоль Яўхімавіч (сакратар) — член Саюза беларускіх пісьменнікаў, старшыня клуба "Спадчына", т. 2-35-66-08 (х.).

СЯБРЫ:

5.Арцімовіч Анатоль Яўхімавіч — скульптар, ст.выкладчык к-ры скульптуры БАМ, т.2-31-26-43 (х.), 2-31-18-35 (сл.).
6. Буралкін Генадзь Васільевіч — старшыня рады Беларускага саюза мастакоў, лаўрэат прэміі Міністэрства культуры РБ, т.2-27-37-23 (сл.).
7.Бураўкін Генадзь Мікалаевіч — паэт, старшыня рэспубліканскай рады ТБМ імя Францішка Скарыны, т. 2-62-29-73 (х.), 2-32-40-92 (сл.).
8. Вашчанка Гаўрыл Харытонавіч — нардны мастак РБ, прафесар к-ры манументальнага мастацтва БАМ, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі РБ, т. 2-32-62-92 (х.), 2-31-59-15 (каф.).
9. Градаў Юры Міхайлавіч — заслужаны архітэктар РБ, лаўрэат Ленінскай прэміі СССР, т. 2-31-44-97 (х., офіс).
10. Гумілеўскі Леў Міхайлавіч — народны мастак РБ, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі РБ, т. 2-36-12-00 (х.).
11. Падлужны Аляксандр Іосіфавіч — дырэктар І-та мовазнаўства імя Якуба Коласа НАНД, акадэмік, т.2-31-85-06 (х.), 2-84-58-18 (сл.), 2-84-58-23 (сл.).
12. Саламонаў Аляксей Андрэевіч — прафесар, старшыня Менскай гарадской рады ТБМ, т. 2-51-61-01 (х.).
13. Слабодчыкаў Уладзімір Іванавіч — загадчык к-ры скульптуры, дацэнт БАМ, т. 2-39-10-49 (х.), 2-39-30-65 (майст.), 2-31-18-35 (сл.).
14. Фінскі Аляксандр Міхайлавіч — ст. выкладчык к-ры скульптуры БАМ, т. 2-24-32-14 (х.), 2-31-18-35 (сл.).
15. Шамякін Іван Пятровіч — народны пісьменнік РБ, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі РБ, т. 2-27-04-78 (х.), 2-998-207 (дача).
16. Шматаў Віктар Фёдаравіч — прафесар І-та мастацтвазнаўства НАНБ, дырэктар Музея старажытнага беларускага мастацтва, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі РБ, т. 2-32-69-37, 2-84-29-17 (х.), 2-84-18-82 (музей).
17. Шчамялёў Леанід Дзмітрыевіч — народны мастак РБ, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі РБ, т. 2-31-41-00 (х.), 2-39-64 (майст.).
18. Лыч Леанід Міхайлавіч — прафесар І-та гісторыі НАНБ, т. 2-32-17-84 (х.).

Пір на касцях.

Нягледзячы на светлую назву, свята Радаўніцы азмрочана для ўсіх вернікаў лёгкім сумам. Мы ўзгадваем тых, хто пайшоў ад нас (блізкіх і далёкіх, сваякоў і сяброў). Магчыма, яны пайшлі ў лепшы, больш дасканалы свет, але іх няма з намі. Нам застаецца толькі памяць. Але ці такая яна добрая ў нас ?

Мы не ведаем імёны тых, хто даўчасна, назаўсёды застаўся ў Курапатах. Колькасць пастаўленых там крыжоў не адпавядае колькасці пахаваных. Але дваццаць восьмага красавіка гэтае месца прыцягнула да сябе ўвагу людзей, якія мелі розныя мэты і розны культурны ўзровень.

У дзве гадзіны дня на месцы гістарычнай трагедыі адбыўся малебен у памяць тых, зхто бязвінна загінуў пад сталінскімі кулямі болей як паўстагоддзе таму. Тыя дваццаць-трыццаць чалавек, якія прысутнічалі на малебне, прыйшлі б сюды ў любым выпадку і ў любое надвор'е. Але вясновае сонца і адносна чыстае паветра краю горада прывабіла і дзесяткі аматараў пікнікоў на прыродзе, на парады перадаці пікнікаваць у іншае месца яны не рэагавалі і нават абураліся на вернікаў альбо не зважалі альбо пацiскалі плячыма і пасміхаліся. І вось усю гэтую карцінку ў сюрэалістычных танах ад нечага ахоўваў міліцэйскі варанок, схаваны за дрэвамі на ўзгорку.

Айцец Уладзімір, які прыехаў з Зялёнага Луга, з царквы, якая яшчэ толькі будзе пабудаваная там у будучыні, казаў пра намаганні, што прыкладаюцца праваслаўнымі і каталіцкімі святарамі на захаванне памяці пра ахвяраў сталінскіх рэпрэсій. Меркавалася ўзвесці ў Курапатах храм і стварыць хаця б падабенства да сапраўдных могілак. Але ўвага дзяржавы да Курапатаў хутка знікла. Што ж тычыцца людзей простых, сярэдніх (можа, і нас з вамі), ім не зашкодзіла б пабудаваць храмы спачатку ў сваіх душах. Каб не паўтараліся ў Беларусі духоўныя і фізічныя "піры на касцях".

Крысціна Курчанкова, Менск

Крыўда " славянскай праўды"

Прачытаўшы артыкул Барыса Мускага "Водгукі" на пераклады вершаў Наталлі Арсенневай змешчаныя у "Нёмане" № 1 за 1998 г. (НС № 9, 11 сакавіка 1998 г.) вырашыў і я выказаць сваю думку.

Верш "Магутны Божа" гэта — духоўны гімн - малітва беларускага народа канкрэтна за сваю Краіну - Беларусь і падмяняць беларускую ідэю гэтага твора нейкай агульнаславянскай недапушчальна.

У іншых народаў ёсць такія ж духоўныя гімны, вось як напрыклад у палякаў "Boze cos Polska" ... і можна уявіць іх рэакцыю, калі б пры перакладзе была падменена польская ідэя гэтага твора якой небудзь агульнаславянскай, як гэта зроблена аўтарам перакладу Яўсеевай у вершы "Магутны Божа", дзе канкрэтныя слова "Беларусь" падмяняецца нейкай "славянскай праўдай".

А можа гэта "славянская праўда" азначае тое, што нашы суседзі — славяне вельмі стараюцца здэнацыяналізаваць наш народ, прыніжаюць яго мову, гісторыю, культуру, каб урэшце падмяніць і назву нашага краю "Беларусь" "Северо-Западным краем" для адных, або "Крэсамі ўсходнімі" для другіх.

Хацелася б нагадаць усім "объединителям" і "создателям" "триединого славянского православного государства", што ў не вельмі далёкай гісторыі была спроба аб'яднаць усіх германцаў і арыйцаў і чым гэта скончылася?

Вельмі дзіўная і пазіцыя журнала "Нёман". Але няхай яны думаюць, што Язерскі з Мускім адзінокія, а справа ў тым, што "Нёман" чытаюць і людзі часта далёкія ад беларускай нацыянальнай ідэі.

Г. Тарасевіч, г.Гародня

Беларусам уваход забаронены !

Менавіта такія шыльды трэба ўжо вешаць на дзверы некаторым дзяржслужачым, каб не дакучалі ім розныя беларусы, карыстаючыся сваёй "хамскай" моваі.

29 красавіка сябра Маладога Фронту Алесь Бацюкоў звярнуўся ў Кастрычніцкі раённы суд з заявай у якой ён прасіў перагледзяць ягоную справу. (Алесь быў пакараны штрафам у памеры 500 тыс.рублёў за тое, што 1 красавіка раздаваў людзям улёткі " у падтрымку прэзідэнта". Але ***тов. Умаров*** адмовіўся прыняць заяву, бо не ведаў беларускай мовы. На пытанне як гэта ён працуе ў дзяржаўнай установе не ведаючы дзяржаўную мову, ***тов.Умаров*** нічога путнага не адказаў.

На наступны дзень, 30 красавіка, Алесь звярнуўся да ***Орловай Л.Е.***, але і тая адмовілася прыняць заяву з той жа прычыны. Пасля настойлівых захадаў яна ўсё ж пагадзілася зарэгістраваць заяву (бо тэрмін падачы скаргі на рашэнне суда скончаўся), але прапанавала на наступны дзень паперу забраць і ***"переписать по-русски"***. Алесь зноў запытаўся, чаму яна, працуючы на дзяржслужбе не ведае дзяржаўнай мовы. Але адказ быў такі: ***"Здесь вопросы задаю я!"***

Дадзены выпадак ёсць яскравай ілюстрацыяй і да стану беларускай мовы пасля сумнавядомага рэферэндуму 1995 г.

Вітаць Макаранка, г. Менск



Марат Гірко.

Гістарычную назву дзяржавы трэба берагчы як сімвал і нацыяналдьную каштоўнасць.

Гаротны лёс у беларусаў — пазбавілі гістарычных назваў "ліцвіны" і "русіны" і сказілі іх гісторыю. Другая назва дасталася расейцам, а першую перанялі сучасныя летувісы, бо мы самі яе не трымаліся. Ды і тая, што зараз носім, доўгі час была забароненая, і краіну нашу называлі проста Паўночна-заходнім краем імперыі.

І застаўся ты, братка беларус, без сваёй назвы, як чалавек, які згубіў сваю памяць, як той збянтэжаны Саўка, у якога напалоханая Магрэта пытае, ці памятае ён сваё імя і колькі яму гадоў. Ёй здалося, што гаспадар звар'яцеў, калі, апрануўшы жаночае адзенне, ганяецца ён за курыцай. Можа, вось такі Саўка ўяўляе сабой тыповы вобраз той часткі сучасных беларусаў, якія не ведаюць, адкуль яны з'явіліся на гэтым свеце.

Непаваротлівыя і нездагадлівыя мы, братка беларус. Калі падманам і гіпнозам аплятуць нашу душу і адымуць гістарычную памяць, цяжка будзе захаваць або вярнуць тое, што належала раней. На жаль, драпежныя істоты, ёсць не толькі ў жывёльным свеце. Яны жывуць і сярод людзей. Але асаблівая і самая небяспечная, істота тая, што спачатку гіпнатызуе ахвяраў, каб зручней праглынуць. Ваўка адразу бачна, што ён драпежнік, і можна паспець ад яго ўцячы, Але ад удава ўцячы цяжка, бо ён паралізуе волю і аплятае свядомасць павуціннем ашуканства, усяляе веру ў тое, што ён быццам табе брат і нічога дрэннага не задумвае.

Калісьці назва "рускі" нацыю не вызначала, а акрэслівала групу славянскіх народнасцяў, на землі якіх прыйшлі варагі з дружынамі і сталі княжыць. Яны і прынеслі гэтую назву, але мова гэтых народнасцяў адрознівалася значна і яны мелі розныя ўласныя назвы. "Русінамі" былі старажытныя беларусы, а больш дакладна той народ, які потым, стаў звацца беларусамі. Казаць трэба менавіта так, бо шавіністы, падманшчыкі і махляры скажуць, што беларусаў раней не было. Так, назвы не было, а народ, продкі беларусаў былі, калі яшчэ саміх шавіністаў і на свеце не існавала. Іх нахабства бессаромнае, бо яны ўпэўненыя, што мы, загіпнатызаваныя іх маной, паверым ім. І многія, хто не можа або не хоча думаць самастойна, вераць у гэтую ману. Ды як жа не паверыць таму, хто сам называе сябе тваім братам? Але брат не павінен хлусіць брату. Гэта так, калі браты шчырыя і сапраўдныя. А калі адзін з іх хлус і захопнік, то падмане абавязкова, бо яго хлусня мае сваю мэту, пра якую ён не гаворыць, а ты і не здагадаешся.

Рускімі зваліся продкі ўкраінцаў, наўгародцы, пскавічы, але ў тыя часы яшчэ ніякіх маскавітаў і вялікаросаў не існавала, бо на гэтых землях славяне яшчэ не жылі, або іх там было не вельмі шмат. Гэта былі землі вуграфінаў. Ёсць звесткі (Іван Ласкоў, Яўген Філіповіч), што на месцы Масквы раней пражывала племя "голядзь" і на яго мове "Масква" гучала як "брудная вада" (Мас+ ква).


Нацыянальнымі назвамі ўсходніх славянаў спачатку былі назвы іх плямённых саюзаў, а агульнай назвай, дзякуючы варагам, стала назва "руския", але яна агульную народнасць не вызначала, бо ў тых народнасцяў не супадалі мова, тэрыторыя пражывання, традыцыі і менталітэт. Параўнанне моў суседніх народаў паказвае, што беларусы і ўкраінцы калісьці мелі агульныя продкаў з палякамі, а вось з сучаснымі расіянамі такія продкі адсутнічалі, бо сучасная расейская нацыя ўтварылася пазней.

Па цікавым законе жывуць пчолы: рой, які вылятае з матчынага вулля, назад у стары вулей не вяртаецца, каб "аб'яднацца" з ім. Бо творчаму развіццю эвалюцыйнага працэсу ў прыродзе садзейнічае не ўніфікацыя, а разнастайнасць. Паміж гэтымі дзвюмя тэндэнцыямі павінны быць аптымальныя суадносіны. Але ў чалавечым грамадстве, на жаль, могуць дзейнічаць іншыя тэндэнцыі і самыя дрэнныя з іх — гвалт і падман.

Маскоўская дзяржава пры князю Іване ІІІ вельмі спрытна пераняла назву "руския" каб прэтэндаваць на ўсе астанія ўсходнеславянскія землі. Але руская назва прысутнічала ў агульнай назве Княства літоўскага, рускага і жамойцкага раней, чым маскавіты афіцыйна назвалі сябе рускімі і нават вялікаросамі. Яны змянілі сваю назву на тую, якая яшчэ не вызначала нацыю і належала суседзям, для таго, каб прэтэндаваць на чужыя землі і абгрунтаваць захопніцкую палітыку. Маскавіты, мабыць, лічылі, што калі яны назавуць сябе рускімі афіцыйна, то суседзі не так будуць палохацца іх дамаганняў, бо прымуць за братоў.

Назва дзяржавы і народа ўяўляе вялікую нацыянальную каштоўнасць, якую трэба берагчы і шанаваць, бо як сведчыць гісторыя, яе могуць пераняць, выкрасці або падмяніць, каб той бестурботны народ, які страціў сваю назву, стаў хутчэй здабычай захопнікаў. Гэта вялікае майстэрства каланізацыі народаў, у якім маскавіты перасягнулі іншых каланізатараў, бо ім было мала далучыць землі суседніх народаў: трэба было гэтыя народы асіміляваць і стварыць вялізную імперыю. Штуршок і здольнасць да гэтага яны атрымалі ад татара-манголаў.

Не вельмі спрытнымі каланізатарамі аказаліся татара-манголы, калі, пакарыўшы рускія княствы і ўсцешыўшыся данінаю, вярнуліся са здабычай у свае стэпы, дaручыўшы збор даніны і кіраванне заваяваным насельніцтвам ранейшым князям. Ніякай асіміляцыі славянскіх народаў татарамі не праводзілася, хоць нейкі працэс узаемнага перамешвання насельніцтва і моў месца. У выніку будучыя расейцы станавіліся больш падобнымі да татараў, а татары — да расейцаў. І дадаткова да таго, што Расея спачатку была больш вугрофінскай, чым славянскай, яна паступова яшчэ і татарызавалася. Так стварылася сучасная руская нацыя, якая па этнічным паходжанні застаючыся малаславянскай, зрабілася славянскай з дапамогаю аб'ядноўчага ўплыву праваслаўнай рэлігіі і яе царкоўна-славянскай мовы, маючай паходжанне ад балгарскай. Гэтая мова паступова трансфармавалася ў сучасную расейскую мову.



Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае

Папярэдняй назваю Расеі была "Залатая Арда", бо заваяваныя татарамі княствы ўваходзілі ў склад Залатой Арды ў якасці ўлусаў, а потым Расея далучыла да сябе ўсе тыя землі і народы якія раней былі ў складзе Арды. Вярхоўная ўлада ў краіне змянілася і перайшла да Маскоўскага цара, а сама краіна — Залатая Арда — ператварылася ў Расею. Але на гэтым Расея не супынілася і "вялікае майстэрства каланізацыі" дазволіла ёй далучыць потым яшчэ вельмі шмат зямель і народаў. У іх увайшла і Беларусь. Такім чынам, можна лічыць, што ўскосна татара-мангольскае іга на Беларусі як бы адбылося з дапамогай пераемніцы Залатой Арды — Расеі.

Татарскае іга ажыццяўлялася пераважна ў выглядзе маскоўскага іга з пераняткай ад татараў жорсткасцю, а існаваўшая дагэтуль вечавая дэмакратыя была знішчаная. Маскоўскае іга з'явілася для суседніх народаў больш небяспечным і гібельным, чым для самой Масковіі, бо яно асімілявала народы з дапамогаю праваслаўнай царквы. Менавіта, як ужо гаварылася, ад царкоўна-славянскай і развілася сучасная расейская мова, а пад уплывам яе больш родпасныя з польскай мовай беларуская і украінская былі значна дэфармаваныя. Але, дзякуй Богу, не зніклі, даючы права на аднаўленне і захаванне нацый.

Асіміляцыя народаў дзейнічае, як чума, з ёю змагацца вельмі цяжка, асабліва, калі ёй лёгка паддаецца просты народ, галасы якога могуць выкарыстаць памагатыя шавіністаў супраць нацыянальнага суверэнітэту Беларусі.

Найлепшымі лекамі супраць асіміляцыі з'яўляюцца любоў да Бацькаўшчыны, мовы, гістарычная памяць і веды аб сваёй гісторыі. Менавіта тое, што так нахабна і жорстка імкнуцца зараз вытруціць і знішчыць у беларусаў. Але не ўдалося анямечыць Чэхію, абрусіць Польшчу і Прыбалтыку, апалячыць Літву і гэтак далей. А што будзе з Беларуссю? Зараз на карысць асіміляцыі яе дзейнічае нават назва, блізкая да назвы расейцаў. Але ж раней наш народ беларусамі не называў сябе, аднак, здарылася так, што зараз завецца. Гэтая назва ўжывалася спачатку на ўсходзе Беларусі, як вынік уплыву Расеі, якая не была зацікаўлена ў назве "Літва", бо гэтая назва маскавітамі лічылася варожай. Расейцы і надалей не будуць наўмысна бачыць розніцы паміж сучаснай і былой Літвой і будуць сцвярджаць, што "літоўцы заваявалі беларусаў", а яны, бач, нас вызвалілі (ад саміх сябе?). Гэтая мана адпавядае намерам Расеі далучыць Беларусь, а гістарычная праўда працуе супраць шавіністаў.

Вельмі цікавую гістарычную здагадку аб паходжанні нашай ранейшай назвы "Літва" прапанаваў Яўген Філіповіч. Ён піша, што Літва мае славянскае паходжанне але больш поўнай назвы "Летавенія" (Лета+Венія). Гэта складанае слова. Першая яго частка азначае па-старaславянску "паўночная". Другая старажытную назву "славянская краіна", бо славяне калісьці называліся "венедамі". Такім чынам Летавенія вызначаецца як "Паўночная славянская краіна". У старадаўнія часы Балтыйскае мора, як піша Я.Філіповіч, называлася Венедскім залівам. Магчыма, гэта значыць, што балты на узбярэжжы Балтыйскага мора пасяліліся пазней ліцвінаў. Летавенія з працягам часу трансфармавалася ў Ліцвенію, Літванію і Літву.

Рэспубліка Летавенія, або Ліцвенія, і яе жыхары ліцвіны — вось нашы гістарычныя назвы. Дык чаму іх не аднавіць? Гучаць яны вельмі прыгожа і мякка, нават музычна. Галоўнае, што гэтыя назвы больш старадаўнія, чым Беларусь і беларусы, і нашы ўласныя, тым больш, што назва "руския" для нас страціла сваю адметнасць, бо перанятая Расеяй. Калі сучасныя летувісы (жамойты) перанялі ад нас, ліцвінаў, назву Літва, не запытаўшыся аб гэтым і зрабіўшы выгляд, што мы з імі быццам не жылі ў агульнай краіне Літве, а сучасныя расейцы перанялі назву "руския", то любы скажа, якія ж вы незалежныя, калі не маеце нават уласнай адметнай назвы. Назва "Ліцвенія" незалежная ад расейцаў і больш старажытная, чым у сучасных літоўцаў, бо спачатку была Летавенія, а ўжо потым скарочаная ад яе назва "Літва".

Адметнасць краіны і народа вызначаецца іх галоўнымі сімваламі: назваю, гербам, сцягам і моваю. Прыняўшы ў 1918 годзе пры абвяшчэнні БНР нацыянальны сцяг і герб "Пагоню", яе "бацькі" захавалі тую назву краіны, якая афіцыйна не ўжывалася раней. Але ж у складзе ВКЛ беларускі этнас пераважаў па насельніцтву, тэрыторыі, пісьменнасці і культуры, што дае большае гістарычнае права на назву "Літва" менавіта нам, а не сучасным летувісам.

Відавочна, што стваральнікі БНР спрацавалі ў пэўным сэнсе супраць саміх сябе і на карысць сучаснай Летуве і Расеі, захаваўшы па сутнасці назву краіны, прывабную для расейцаў. Гэта дазволіла сучасным літоўцам прэтэндаваць на большую частку спадчыны ВКЛ і змяншыць ролю беларусаў - ліцвінаў у былой агульнай літоўскай дзяржаве.

г. Менск

Рэдактар Станіслаў Суднік

Заснавальнік: ТБМ імя Францішка Скарыны.
Пасведчанне аб рэгістрацыі: № 83 ад 28 чэрвеня 1996 г.
Адрас рэдакцыі: 220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13.
Адрас для паштовых адпраўленняў: 231300, г. Ліда-2, п/с 7.

Рэдакцыйная рада: Генадзь Бураўкін — старшыня, Людміла Дзіцэвіч, Сяргей Запрудскі, Аляксей Пяткевіч, Аляксей Рагуля, Аляксей Саламонаў, Павел Сцяцко, Алег Трусаў, Эрнэст Ялугін.

Аўтары нясуць поўную адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных інфармацыі.

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні ўпраўлення грамадска-палітычнай інфармацыі і друку Гродзенскага аблвыканкама. 231300, г.Ліда, вул. Ленінская, 23.
Кошт па дамове.Газета падпісана да друку 15. 06. 98 г.
Наклад 3500 асобнікаў. Замова № 1597.
Падпісны індэкс: 63865.
Кошт падпіскі: 1 мес.- 12 000 руб., 3 мес.- 36 000 руб.